План-канспект урока

па вучэбным прадмеце “Матэматыка”, IV клас

*Пальчукевіч Зоя Іванаўна, настаўнік пачатковых класаў першай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі "Бердаўская базавая школа Лідскага раёна"*

**Тэма:** Плошча прамавугольніка

**Тып урока:** адкрыццё новых ведаў

**Мэта:** пазнаёміць са спосабам вылічэння плошчы прамавугольніка; выпрацоўваць уменне рашаць задачы на знаходжанне плошчы прамавугольніка; удасканальваць вылічальныя навыкі;

развіваць лагічнае мысленне, матэматычную мову;

выхоўваць цікавасць да гістарычнага мінулага малой радзімы.

**Абсталяванне:** мульціборд, падручнік “Матэматыка. 4 клас. Частка 1», Г.Л.Мураўёва, М.А.Урбан, рабочы ліст “Плошча прамавугольніка”, карткі для індывідуальнай працы, карткі для групавой даследчай працы, індывідуальныя лісты самакантролю, прылады для вымярэння даўжыні (рулетка, лінейка, сантыметр, лазерны ўзровень, прылада для вымярэння плошчы – “каза”), “музей у чамадане”.

Ход урока

**І. Арганізацыйны этап**

*На дошцы картка з матэматычнымі знакамі.*

- Я жадаю, каб сёння на ўроку вы павялічылі свае веды (+), паменшылі свае памылкі (-), памножылі свае поспехі (*) і падзяліліся(:) пасля ўрока добрым настроем з сябрамі і бацькамі.

- А эпіграфам нашага ўрока стануць словы французскага пісьменніка Анатоля Франса “Лепш засвойваюцца тыя веды, якія паглынаюцца з апетытам!” (СЛАЙД 1)

- Усім прыемнага апетыту!

**ІІ. Хвілінка чыстапісання** (СЛАЙД 2)

Першы лік вы адгадаеце, калі павялічце 70 ў 10 разоў. Чым цікавы дадзены лік (700 гадоў споўнілася Лідзе)?

Другі лік азначае важную дату ў жыцці беларускага народа, якую мы адзначылі вясной (78 гадоў са Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне).

Трэці лік назаве важную дату для нашай школы (75 гадоў споўнілася Бердаўскай школе).

Прапісваем у сшытках лікі 700, 78, 75.

**ІІІ. Вусны лік**

Калі вы правільна выканаеце заданні, то даведаецеся тэму і мэту ўрока.

1. Калі вы вылічыце суму лікаў 1227 і 300, то даведаецеся год ўзнікнення вёскі Бердаўка (1527) (СЛАЙД 3).

2. Калі вы рашыце ўраўненне Х:10=186, то даведаецеся, калі пабудаваны палац Аляксандра Дамбавецкага (1860) (СЛАЙД 4).

3. Калі вы павялічыце 1200 на 748, то даведаецеся, калі наша школа ўпершыню адчыніла дзверы (1948) (СЛАЙД 5).

4. Калі вы знойдзіце лік, у якім 1 адз. 4 разраду 3 адз. 3 разраду 2 адз.2 разраду 3 адз. 1 разраду, то даведаецеся год заснавання горада Ліды (1323) (СЛАЙД 6).

5. Калі вы знойдзіце рознасць лікаў 2000 і 11, то даведаецеся год заснавання Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народага музея (1989) (СЛАЙД 7).

- Трэба адзначыць, што ганаровае званне “народны” наш музей атрымаў у 2005 годзе і ў трэці раз пацвярджае яго, дзякуючы зладжанай працы настаўнікаў, вучняў і жыхароў аграгарадка Бердаўкі.

- Атрыманыя лікі запішыце ў парадку ўзрастання і назавіце стагоддзе, якому яны адпавядаюць (1323, 1527,1860, 1959, 1989) (СЛАЙД 8).

- Правільна выкананае заданне адкрывае нам словы музей, плошча, чамадан (СЛАЙД 12).

- Як гэтыя словы могуць быць звязаны з тэмай і мэтай нашага ўрока (слова “плошча” падказвае, што на ўроку мы будзем знаходзіць плошчу фігур) ?

- Дарэчы, гэтае слова мае некалькі значэнняў (СЛАЙД 9).

1. Плошча Перамогі ў сталіцы нашай Радзімы горадзе- герої Мінску.

2. Будаўнічая плошча, альбо пляцоўка Нацыянальнай бібліятэкі.

3. Плошча геаметрычных фігур.

- Якая з дадзеных плошчаў спатрэбіцца нам на ўроку (плошча геаметрычных фігур) ?

- Як звязаць слова “музей” з мэтай нашага ўрока (слова “музей” азначае, што мы будзем працаваць з нейкімі музейнымі экспанатамі) ?

Праблемнае пытанне:

-А пры чым тут чамадан?

***“Момант нечаканасці”.*** *Настаўнік дэманструе музейны экспанат чамадан і расказвае гісторыю. Стары Чамадан, які шмат падарожнічаў па беларускай зямлі, цяпер жыве ў музеі і вельмі сумуе, калі застаецца без дзяцей. Таму ён вырашыў заняцца карыснай справай: стварыць “Музей у чамадане”, каб наведваць урокі школьнікаў і знаёміць іх з музейнымі экспанатамі.*

*Навучэнцы прыходзяць да высновы, што чамадан мае прамавугольную форму і называюць тэму ўрока: “Плошча прамавугольніка”.*

**IV. Мэтапалажэнне**

- Малайцы! Для таго, каб вызначыць мэту ўрока, нам трэба адказаць на 3 пытанні (што? як? дзе?) (СЛАЙД 10).

*Навучэнцы фармулююць мэту ўрока і зачытваюць яе са слайда* (СЛАЙД 11).

1. Раскрыць паняцце “плошча прамавугольніка”.
2. Навучыцца знаходзіць плошчу прамавугольніка.
3. Падумаць, дзе нам спатрэбяцца веды пра плошчу прамавугольніка.

**V. Вывучэнне новага матэрыялу**

1. *На экране з’яўляецца плакат з геаметрычнымі фігурамі* (СЛАЙД 12).

- Ці згодны вы, што фігуры на экране з’яўляюцца прамавугольнікамі?

*Навучэнцы паўтараюць характарыстыкі прамавугольніка, выбіраюць прамавугольнікі з пяці фігур.*

- Як мы можам вымераць плошчу дадзеных прамавугольнікаў (пры дапамозе палеткі, прыкладна на вока, пры дапамозе квадратнага сантыметра)?

- Што такое квадратны сантыметр (Квадрат са стараной 1см)?

- Паспрабуйце вымераць плошчу сваіх прамавугольнікаў квадратным сантыметрам. Ці зручна гэта рабіць (не, нязручна)?

- Як мы зможам вырашыць гэту праблему (знайсці іншы спосаб)?

- Давайце звернемся да прамавугольнікаў, якія прапануюць нам разгледзець два спосабы знаходжання плошчы (СЛАЙД 13).

*Навучэнцы тлумачаць, што квадратныя сантыметры размешчаны ў слупочках і радочках, але вынікі вылічэнняў маюць аднолькавае значэнне. Паўтараецца правіла перамяшчальнага закона: ад перастаноўкі множнікаў здабытак не мяняецца.*

- Як называюцца стораны прамавугольніка? Што неабходна зрабіць, каб вылічыць плошчу прамавугольніка? Якая формула ў нас атрымалася (СЛАЙД 14)?

- Для практычнага вымярэння даўжыні і шырыні прамавугольных прадметаў нам спатрэбяцца прылады. Чым мы можам карыстацца?

*Стары Чамадан прапануе драўляную лінейку, рулетку, швейны сантыметр, складную лінейку. Настаўнік дэманструе вымяральную прыладу “каза” і прапануе на перапынку вымераць ёй плошчу школьнага калідора. Дэманструецца сучасны вымяральны прыбор – лазерны ўзровень* (СЛАЙД 15).

Выснова: вымяральныя прыборы, якімі карысталіся нашы продкі, удасканальваюцца на карысць чалавеку.

**VI. Замацаванне**

*Практычная частка. Заданні-доследы ад Старога Чамадана. Дэманструецца ручнік і посцілка. Вызначаецца іх роля ў сялянскай хаце* (СЛАЙД 16).

**VII. Фізкультхвілінка**

*Навучэнцы аб'ядноўваюцца ў дзве групы, выбіраюць зручную прыладу для вымярэння даўжыні і шырыні ручніка і посцілкі. Дадзеныя вылічэнні запісваюць у таблічку на дошцы.*

**Дыферэнцыраваная работа**

Задача №1. Колькі $см^2$ льняной тканіны спатрэбіцца, каб пашыць такі ж ручнік для сустрэчы гасцей?

Задача №2. Ці хопіць дадзенай посцілкі, каб заслаць ложак Алесіка, плошча паверхні якога 8000 $см^2$ ?

*Два вучні запісваюць рашэнне задач на дошцы.*

Выснова: каб знайсці плошчу ручніка і посцілкі, неабходна памножыць даўжыню на шырыню.

**Работа з падручнікам.** Знайдзіце формулу знаходжання плошчы прамавугольніка ў падручніку і параўнайце з нашай формулай. Ці супадаюць яны (так, супадаюць)?

- Давайце для замацавання ведаў складзем алгарытм знаходжання плошчы прамавугольніка. Напомніце мне, што такое алгарытм (гэта план нейкіх дзеянняў для атрымання выніку).

*Навучэнцы складаюць алгарытм знаходжання плошчы прамавугольнікана на дошцы.*

Стары Чамадан вельмі задаволены вашай работай. Ён шмат гадоў жыве ў музеі і, як аказалася, да нашага ўрока нічога не ведаў пра паняцце "плошча". Таму ён запрашае наведаць музейныя пакоі, вымераць іх плошчу і вылічыць агульную плошчу Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея.

**Самастойная праца ў парах**

Рабочы лісток "Плошча музея" (СЛАЙД 17).

1. Вымераць даўжыню і шырыню музейных пакояў.
2. Знайсці плошчу кожнага пакоя. Самаправерка (СЛАЙД 18).
3. Пабудаваць на дошцы дыяграму па выніках вылічэнняў.
4. Вызначыць самы вялікі і самы малы па плошчы пакой музея.
5. Знайсці агульную плошчу музея.

Выснова: на агульнай плошчы ў 145 $м^2$ у Бердаўскім гісторыка-краязнаўчым народным музеі размешчана больш за 3200 экспанатаў.

**VIII. Падвядзенне вынікаў урока**.

Выніковы тэст (СЛАЙД 19).

Узаемаправерка (СЛАЙД 20).

Унясенне вынікаў тэста ў лісты самаацэнкі. Каментаванае выстаўленне адзнак.

**IX. Хатняе заданне** (старонка 74).

Праглядзіце заданні. Якія пытанні ўзніклі?

**X. Рэфлексія “Якія веды я вазьму са Старога Чамадана”**

-Ці дасягнулі мы пастаўленай мэты?

Выберыце і працягніце сказ:

- Калі я стану (настаўнікам, архітэктарам, урачом, аграномам, інжынерам, будаўніком, мадэльерам…), мне спатрэбяцца веды пра плошчу прамавугольніка.

- Калі мае бацькі будуць рабіць рамонт, я змагу….

- Калі бабуля будзе садзіць агарод, я дапамагу…

- Шмат цікавых экспанатаў яшчэ засталося ў Старым Чамадане. Але гэта будзе ўжо зусім іншая гісторыя. Да новых сустрэч, наш добры дружа! Усім вялікі дзякуй за ўрок!